**ЭКСКУРСІЙНЫ МАРШРУТ**
**«ГЕЛЯНОВА. ДАВАЕННАЯ АРХІТЭКТУРА І ГІСТОРЫЯ.**
**ПАДАРОЖЖА ПА МАЛАДЗЕЧНЕ ПЕШШУ»**

**Аўтары:** *Рубацкая Марыя Юр'еўна, Цішко Ганна Валер'еўна, навучэнцы Дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі «Маладзечанскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі «Маладзік», аб'яднанне па інтарэсах «Следапыт».*

**Кіраўнік:** *Трацяк Валерый Браніслававіч, педагог дадатковай адукацыі Дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі «Маладзечанскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі «Маладзік»*

**Мэта экскурсіі:** спрыяць фарміраванню ў навучэнцаў грамадзянска-патрыятычных якасцяў на прыкладах нашай гісторыі; спрыяць пашырэнню кругагляду і выхаванню пазнавальных інтарэсаў і здольнасцяў.

**Задачы экскурсіі:**

выхаваць пачуцці грамадзянскасці, патрыятызму, павагі да гісторыі і сучаснасці малой радзімы;

сфарміраваць уяўленне аб даваеннай архітэктуры ў горадзе Маладзечна;

развіваць экскурсійна-турыстычную дзейнасць у рэгіёне, папулярызаваць краязнаўчыя экскурсіі.

**Тып экскурсіі:** гісторыка-краязнаўчы.

**Від:** пешаходная.

**Працягласць:** 1 гадзіна.

**Даўжыня маршруту:** 1 км.

**Маршрут:** 1 (1 нумар на плане) казармы, (вучэбны корпус МДПК) – 2 (8), воданапорная вежа – 3, 4 (7), жылыя дамы для сяржантаў – 5, 6 (2), дамы для афіцэраў – 7 (4), афіцэрскі клуб – 8 (6), пляц – 9 (5), штаб 86-га палка – 10 (10), дом каменданта гарнізона – 11 (7), дом для сяржантаў (па вул. Машэрава) – 12, стайні (па вул. Драздовіча).

**Змест экскурсіі:** змест па распрацаваным маршруце сфарміраваны ў адпаведнасці з тэхналагічнай картай маршруту і прадстаўленым матэрыялам аглядаемых аб'ектаў. Экскурсія, у такім выпадку, будзе мець наступную структуру:

знаёмства з кароткай гісторыяй 86-га пяхотнага палка, які размяшчаўся ў Гелянове ў 1922-1939 гг.;

знаёмства з архітэктурай, уключанай у экскурсійны маршрут.

Гісторыя гарнізона ў Гелянове пачалася ў 1922 годзе, калі 86-ы пяхотны полк Войска Польскага быў пераведзены сюды з Вільні. Полк быў набраны з жыхароў Мінска і Міншчыны падчас савецка-польскай вайны ў 1919 годзе і ўваходзіў у склад так званых сіл «Самаабароны Літвы і Беларусі» пад назвай «Мінскі Стральцовы полк». Ён адзначыўся ўдзелам у Варшаўскай бітве. У лістападзе 1920 года полк прыняў удзел у паходзе на Вільню генерала Жалігоўскага, у выніку якога ўтварылася новая дзяржава – Сярэдняя Літва са сталіцай у Вільні. Тут полк знаходзіўся да сакавіка 1922 года, калі ў выніку сумеснага акта соймаў у Варшаве і Вільні Віленскі край быў прыняты ў склад Польшчы, а Войска Сярэдняй

Літвы было ўключана ў Войска Польскае. Тады «Мінскі Стральцовы полк» стаў 86-м пяхотным палком Войска Польскага і быў пераведзены ў фальварак Гелянова, дзе размяшчаліся асноўныя сілы палка. Штаб палка спачатку знаходзіўся на вуліцы Замкавай у Маладзечне, трэці батальён – у вёсцы Краснае, а батальён запасу застаўся каля Вільні – у Новай Вільні.

У 1924 годзе ў фальварку Гелянова пачалося шырокае будаўніцтва. Былі ўзведзены цагляныя казармы для радавых, закладзены дамы для афіцэраў і сяржантаў, а таксама іншыя будынкі армейскай інфраструктуры гарнізона. У канцы 1920-х гадоў ваенны гарадок ужо займаў вялікую плошчу, абмежаваную, калі глядзець на сучасны план Маладзечна, вуліцамі Драздовіча, Ясінскага, Чайкоўскага і Б. Хмяльніцкага. Тут пражывалі 68 афіцэраў з сем'ямі і 2200 сяржантаў і радавых рэгулярнай арміі. У 1929 годзе фальварак Гелянова ўвайшоў у склад горада Маладзечна. У тым жа годзе на паўночным уездзе ў гарнізон была ўзведзена трыумфальная арка ў гонар кіраўніка Польшчы Юзэфа Пілсудскага. Адкрыццё аркі адбылося ў час святочных мерапрыемстваў, прысвечаных дзесяцігоддзю 86-га пяхотнага палка.

**Агульныя арганізацыйныя рэкамендацыі:**

падчас экскурсіі строга сачыць за выкананнем правілаў бяспекі ўдзельнікамі экскурсіі, правілаў дарожнага руху, інструктаваць экскурсантаў аб захаванні нормаў бяспекі пры аглядзе аб'ектаў.

Уступ да экскурсіі:

арганізацыйнае ўступленне зрабіць пры сустрэчы з групай да пачатку руху, прадставіцца групе, агаварыць неабходныя арганізацыйныя пытанні і нагадаць аб правілах паводзін у час экскурсіі і нормах бяспекі;

у інфармацыйнай часткі ўступа коратка паведаміць аб тэме і асноўных аб'ектах экскурсіі;

наладзіць экскурсантаў на ўспрыманне маючай адбыцца экскурсіі і ўсталяваць з імі эмацыйна-псіхалагічны кантакт;

працягласць ўступлення 5 хвілін.

**Заключэнне**. Зрабіць каля дома каменданта гарнізона

Працягласць заключэння – 5 хвілін.

**Аглядны план аб’ектаў экскурсіі**




**1 – казармы, 2 – дамы для афіцэраў, 3 – трыумфальная арка, 4 – афіцэрскі клуб, 5 – штаб 86-га палка, 6 – пляц, 7 – жылыя двухпавярховыя дамы, 8 – воданапорная вежа, 9 – стайні, 10 – дом каменданта гарнізона.**

ТЭХНАЛАГІЧНАЯ КАРТА МАРШРУТУ «ГЕЛЯНОВА. ДАВАЕННАЯ АРХІТЭКТУРА І ГІСТОРЫЯ. ПАДАРОЖЖА ПА МАЛАДЗЕЧНЕ ПЕШШУ»

| **Маршрут** | **Аб'ект паказу** | **Працягласць паказу** | **Найменне падтэмы і асноўныя пытанні** | **Арганізацыйныя пытанні** | **Метадычныя ўказанні** |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. Казармы для салдат (1) | Казармы для салдат | 4-5 хвілін | Казармы для салдат.<br>Пасля Вялікай Айчыннай вайны размяшчаліся адміністрацыйныя службы Маладзечанскай вобласці, у т.л. абкам камсамола, першы сакратар Пётр Машэраў. Пазней размяшчаліся: інтэрнат політэхнікума, вучэбныя аўдыторыі медвучылішча. Цяпер, пасля рэканструкцыі да «Дажынак», размяшчаюцца вучэбныя аўдыторыі політэхнічнага каледжа | Група размяшчаецца паўколам, такім чынам, каб казармы для салдат былі відны ўсім | Выкарыстоўваць прыёмы паказу (папярэдні агляд, нагляднасць) і аповеду (экскурсійнай даведкі). |
| 2. Воданапорная вежа (8) | Воданапорная вежа | 4-5 хвілін | Воданапорная вежа забяспечвала вадой усе службы гарнізона.<br>На сценах вежы бачны сляды ад снарадаў часоў 2-й Сусветнай вайны.<br>Цяпер не эксплуатуецца.<br>Да яе прыбудаваны прыватны дом. | Група размяшчаецца паўколам | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, экскурсійнай даведкі. |
| 3. Жылы дом для сем'яў сяржантаў і падафіцэраў (7) | Жылы дом для сем'яў сяржантаў і падафіцэраў | 4-5 хвілін | Адзін з самых распаўсюджаных тыпавых жылых дамоў у польскіх гарнізонах для падафіцэраў. У Гелянове яны будаваліся двухпавярховымі на 12 і 8 кватэр.<br>Цяпер гэта жылы дом з усімі выгодамі па вул. Чкалава. | Група размяшчаецца паўколам | Выкарыстоўваць прыёмы паказу (папярэдні агляд, нагляднасць) і аповеду (экскурсійнай даведкі). |
| 4. Жылы дом для сем'яў сяржантаў і падафіцэраў (7) | Жылы дом для сем'яў сяржантаў і падафіцэраў | 4-5 хвілін | Яшчэ адзін прыклад тыпавых жылых дамоў у польскіх гарнізонах для падафіцэраў. У Гелянове яны будаваліся двухпавярховымі на 12 і 8 кватэр.<br>Цяпер гэта жылы дом з усімі выгодамі па вул. Чкалава.<br>Перад «Дажынкамі» быў рэканструяваны. | Група размяшчаецца паўколам | Выкарыстоўваць прыёмы паказу (папярэдні агляд, нагляднасць) і аповеду (экскурсійнай даведкі). |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 5. Жылы дом для сем'яў афіцэраў (2) | Жылы дом для сем'яў афіцэраў | 4-5 хвілін | Для жылля афіцэраў былі распрацаваны тыпавыя праекты з рысамі функцыяналізму на 18 кватэр. Архітэктар Уладзіслаў Палкоўскі. На 4-м паверсе размяшчаліся пральні з памяшканнямі для сушкі бялізны. У пасляваенны час дом быў перабудаваны пад 27 кватэр.<br>Знаходзіцца па вул. Машэрава, 17. | Група размяшчаецца паўколам | Выкарыстоўваць прыёмы паказу (папярэдні агляд, нагляднасць) і аповеду (экскурсійнай даведкі). |
| 6. Жылы дом для сем'яў афіцэраў (2) | Жылы дом для сем'яў афіцэраў | 4-5 хвілін | Дом знаходзіцца па вул.Машэрава, 2, насупраць вышэйзгаданага. Пабудаваны з шэрай цэментнай цэглы, папулярнай у міжваеннай Польшчы. Будавалі гэтыя дамы англічане. Кожная цэгла была асобна загорнута ў паперу і мела кляймо. На 4-м паверсе некалькі памяшканняў перароблены пад кватэры. На сценах можна разгледзіць сляды ад куль – сведчане жорсткіх баёў у ліпені 1944 года. Гэты дом не быў пафарбаваны і мае першапачатковы выгляд. | Група размяшчаецца паўколам | Выкарыстоўваць прыёмы паказу (папярэдні агляд, нагляднасць) і аповеду (экскурсійнай даведкі). |
| 7. Афіцэрскі клуб (4) | Афіцэрскі клуб | 4-5 хвілін | Будынак у часы 86-га палка быў культурна-забаўляльным цэнтрам гарнізона. Тут знаходзіліся клуб афіцэраў, казіно і афіцэрская сталовая. Са сталовай афіцэры маглі браць абед і вячэру на кватэру.<br>Пасля вайны ў будынку размяшчаўся гарадскі дом культуры, а з 1991 года – Мінскі абласны драматычны тэатр. | Група размяшчаецца паўколам | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, экскурсійнай даведкі. |
| 8. Пляц (6) | Пляц | 4-5 хвілін | Армейскі пляц, які таксама выкарыстоўвалі ў якасці іпадрома.<br>На месцы пляца пасля вайны быў размешчаны гарадскі стадыён. | Група размяшчаецца паўколам | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, экскурсійнай даведкі. |
| 9. Штаб 86-га палка (5) | Штаб 86-га палка | 4-5 хвілін | Будынак штаба 86-га пяхотнага палка. Да нашага часу ў ім захаваліся радыятары старой | Група размяшчаецца | Выкарыстоўваць прыёмы паказу |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | ацяпляльнай сістэмы і частка вокнаў нетыповай падоўжанай формы.<br>Зараз тут знаходзяцца ўралагічнае і хірургічнае аддзяленні раённай бальніцы. | паўколам | (папярэдні агляд, нагляднасць) і аповеду (экскурсійнай даведкі). |
| 10. Дом каменданта гарнізона (10) | Дом каменданта гарнізона | 4-5 хвілін | Дом каменданта гарнізона.<br>Пабудаваны з такой жа цэглы, як і афіцэрскія дамы. Дом вельмі цёплы. У даваенныя часы да яго быў падведзены кабель сувязі з Варшавай.<br>У часы Маладзечанскай вобласці тут жыў С.В. Прытыцкі, першы сакратар Маладечанскага абкама КПБ.<br>Пазней размяшчаўся дзіцячы садок №5. Цяпер – дзіцячы цэнтр «Расток». | Група размяшчаецца паўколам | Выкарыстоўваць прыёмы паказу (папярэдні агляд, нагляднасць) і аповеду (экскурсійнай даведкі). |
| 11. Жылы дом для сем’яў сяржантаў і падафіцэраў (7) | Жылы дом для сем’яў сяржантаў і падафіцэраў | 4-5 хвілін | Жылы дом для падафіцэраў.<br>На другім паверсе захаваліся тыповыя ваконныя рамы. | Група размяшчаецца паўколам | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, экскурсійнай даведкі. |
| 12. Стайні | Стайні | 4-5 хвілін | Гэты будынак былых стайняў захаваўся па вул. Драздовіча, насупраць адміністрацыйнага корпуса ЗАТ «Маладзечнамэбля».<br>У пасляваенныя часы гэтыя стайні былі перабудаваны пад жылыя памяшканні, і людзі жылі тут да нядаўняга часу.<br>Іншыя стайні былі прыстасаваны пад цэхі ЗАТ «Маладзечнамэбля» альбо былі з цягам часу знесены. | Група размяшчаецца паўколам | Выкарыстоўваць прыёмы паказу (папярэдні агляд, нагляднасць) і аповеду (экскурсійнай даведкі). |



**Фота 1. Казармы для салдат**



**Фота 2. Воданапорная вежа**



**Фота 3. Жылы дом для сем'яў сяржантаў і падафіцэраў**



**Фота 4. Жылы дом для сем'яў сяржантаў і падафіцэраў**



**Фота 5. Жылы дом для сем'яў афіцэраў**



**Фота 6. Жылы дом для сем'яў афіцэраў**



**Фота 7. Афіцэрскі клуб**



**Фота 8. Пляц**




**Фота 9. Штаб 86-га палка**



**Фота 10. Дом камянданта гарнізона**



**Фота 11. Жылы дом для сем’яў сяржантаў і падафіцэраў**



**Фота 12. Стайні**